ДЗЯРЖАЎНЫ
ПАГРАНІЧНЫ КАМІТЭТ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

вул. Валадарскага, 24, 220050, г. Мінск
тэл. (017) 328 54 06, тэл./факс: (017) 327-70-03
E-mail: gpk@gpk.gov.by

ГОСУДАРСТВЕННЫЙ
ПОГРАНИЧНЫЙ КОМИТЕТ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

ул. Володарского, 24, 220050, г. Минск
тел. (017) 328 54 06, тел./факс: (017) 327 70 03
E-mail: gpk@gpk.gov.by

24.04.2020 № 1-21/395-Кол-41Б
На № ______ ад _________ Email:

Аб разглядзе звароту

У Дзяржаўным пагранічным камітэце (далей – Дзяржпагранкамітэт) у межах кампетэнцыі разгледжан накіраваны Вамі калектыўны зварот аб беларуска-расійскім участку дзяржаўнай граніцы.

Па сутнасці інфармуем, што прававы статус дзяржаўнай граніцы былой адміністрацыйнай мяжы БССР і РСФСР нададзены пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 11 чэрвеня 1993 г. № 2379-XII «О придании границе Республики Беларусь с Российской Федерацией, Украиной, Литовской Республикой и Латвийской Республикой правового статуса Государственной границы».

Тэрытарыяльная цэласнасць і непарушнасць існуючай граніцы паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй замацаваная ў Дагаворы аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй (падпісаны 21 лютага 1995 г., уступіў у сілу 11 жніўня 1995 г.).

Разам з тым, у адпаведнасці з артыкулам 7 Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы ад 8 снежня 1999 г. тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі складаюць тэрыторыю Саюзнай дзяржавы. Знешняй граніцай Саюзнай дзяржавы з'яўляюцца граніцы дзяржаў-удзельніц з іншымі дзяржавамі.

Асноўныя прынцыпы аховы беларуска-расійскага ўчастка дзяржаўнай граніцы выкладзены ў Пагадненні паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Расійскай Федэрацыі аб супрацоўніцтве па пагранічных пытаннях ад 15 красавіка 1994 г.

Згодна з палажэннямі вышэйзгаданых міжнародных дамоваў Рэспубліка Беларусь і Расійская Федэрацыя ажыццяўляюць належныя меры па забеспячэнні бяспекі адзін аднаго на сваіх знешніх граніцах.

Акрамя таго, згодна з артыкулам 16 Закона Рэспублікі Беларусь ад 21 ліпеня 2008 года № 419-З «О Государственной границе Республики Беларусь» Дзяржаўная граніца Рэспублікі Беларусь устанаўліваецца і змяняецца ў адпаведнасці з міжнароднымі дамовамі Рэспублікі Беларусь.

У цяперашні час дагавор аб дзяржаўнай граніцы з Расійскай Федэрацыяй Рэспублікай Беларусь не складаўся.

З улікам выкладзенага, на беларуска-расійскім участку дзяржаўнай граніцы пункты пропуску не ўсталёўваліся, ахова дзяржаўнай граніцы органамі пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь не ажыццяўляецца, інфраструктура дзяржаўнай граніцы і прыгранічнай тэрыторыі Рэспублікі Беларусь не абсталюецца.

Такім чынам, у цяперашні час падстаў для задавальнення Вашага звароту не маецца.

Аб выніках разгляду звароту прашу праінфармаваць іншых заяўнікаў.

У выпадку нязгоды з рашэннем, прынятым па Вашым звароце ў Дзяржпагранкамітэце, Вы маеце права абскардзіць яго ў суд.

Начальнік упраўлення дэлімітацыі і дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь

У.Л.Каваленка

29 Каваленка 287 06 22